3. Зазірніце ў старадаўні куфар! [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: https://www.sb.by/articles/zaz-rn-tse-starada-n-kufar.html – Дата доступу: 28.02.2022.

4. Кухаронак, Т.І. Радзінныя звычаі і абрады беларусаў / Т.І.Кухаронак. – – Мн.: Навука і тэхніка, 1993. – 126 с.

5. Міцкевіч, А.М. Сямейная абраднасць беларускага народа / А.М.Міцкевіч. – Мн., 1966 г.

6. Фальклорная практыка: практычны дапаможнік па раздзелу "Прыкметы і павер'і сямейнай абраднасці" для студэнтаў спецыяльнасці 1- 21 05 01"Беларуская філалогія" / В. С. Новак, А.А. Кастрыца, А.М. Палуян; М-ва адукацыі РБ, Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф. Скарыны. – Гомель: ГДУ імя Ф. Скарыны, 2009. – 59 с.

7. Сержпутоўскі, А.К. Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў / А.К. Сержпутоўскі; навук. рэд. А.С. Фядосік; прадм. У.К. Касько; маст. В.Р. Мішчанка. – Мн.: Універсітэцкае, 1998. – 301 с.

8. Скарбы з вясковых куфраў: Традыцыйны касцюм і тэкстыль з калекцыі "Народнае мастацтва Беларускага Палесся": ілюстраваны каталог Віннікава М.М., Богдан П.А.

9. Сысоў, У.М. З крыніц спрадвечная / У.М.Сысоў. – Мн., 1997 г.

10. Этнаграфія Беларусі. Энцыклапедыя. – Мн., 1989 г.

Лещёва М.П, студент 314 группы
дневной формы обучения
Научный руководитель – Котович О.В,
старший преподаватель

## РЫТУАЛЬНЫЯ ВОГНІШЧЫ ЯК СКЛАДОВАЯ БЕЛАРУСКІХ АБРАДАЎ

З таго моманту, як стварыўся свет, з’явіўся агонь. Ён заўсёды быў разам з чалавекам. У беларускай міфа-паэтычнай творчасці існуе шмат легенд і паданняў аб тым, як узнік агонь. У адным з іх сцвярджаецца, што Бог, які выгнаў Адама з Раю і, каб той “не тросся з холаду”, падказаў яму, як распаліць агонь: “Вазьмі два сухія ясяновыя паленкі і тры адзін аб другі” [2, с. 43]. У другім паданні агонь людзям даў Пярун, які хацеў забіць чорта, бо той падманваў першых людзей: “Чорт круціўся-круціўся, няма куды дзецца, от нарэшце ён і сунуўся пад сухастойнае дзерава. Пярун, каб забіць чорта, як трэснуў у тое дзерава, дак яно й загарэлася. Адам быў блізка, дак і ўзяў сабе агнюЗмей той запоўз пад сухое дрэва, таму, калі трэснуў па гэтым дрэве Пярун, яно загарэлася, а Адам узяў сабе агонь” [2, с. 44].

Згодна паданняў людзі навучыліся здабываць “справядлівы” агонь пры дапамозе ясяновага клінка і верацяна, і “шморгаючы смычком то сюды, то туды, штораз скарэй” [2, с. 43]. Безумоўна, гэта далёка не ўсе варыянты міфалагічных тэкстаў, у якіх распавядаецца пра ўзнікненне агню, але галоўнае, што ён быў і застаецца разам з намі, ён па сённяшні дзень дае цяпло і сімвалізуе ўтульнасць жытла чалавека.

Галоўнай формай здабытага агню ў нашых продкаў было вогнішча, пры дапамозе якога можна было сагрэцца, прыгатаваць нескладаную ежу. У цэнтры нашага даследавання будзе рытуальнае вогнішча. Распальванне вогнішча, як рытуальнае дзеянне шматлікіх каляндарных, сямейна-родавых, гаспадарчых абрадаў, здаўна вядома ўсходнім славянам, галоўнымі функцыямі якога былі ачышчэнне і адраджэнне. Нашы продкі верылі, што рытуальнае вогнішча забярэ ўсё дрэннае і дасць магчымасць абнавіць, а значыцца, палепшыць сваё жыцце. Менавіта таму распальванне рытуальнага вогнішча было абавязковым падчас выканання шэрагу абрадаў і святочных дзён: людзі верылі ў ачышчальную моц агню як для самога чалавека, так і для яго жытла.

Часцей за ўсё вогнішчы палілі ў вялікія гадавыя святы: на Грамніцы, Дабравешчанне, Юр’е, Сёмуху, Пятроў дзень, Вялікдзень, радзей напярэдадні Новага года або падчас святкавання Калядаў [3, с. 2].

Адным з галоўных свят веснавога цыкла ў беларускім народным календары з’яўляецца Масленіца – свята ў гонар Зямлі, Сонца і Агню. Месцам святкавання часцей за ўсё з’яўлялася горка або невялікае ўзвышша: “ішлі туды, дзе бліжэй да Сонейка” [3, с. 12]. Не менш значным былі адносіны да агню, таму што адной з складовых гэтага шматдзённага і шматэтапнага святкавання было спальванне на рытуальным вогнішчы пудзіла Зімы або Масленіцы. Гэтая падзея адбывалася ў суботу напрыканцы Развітальнага тыдня ( так у некаторых мясцінах называлі свята Масленіцы). У гэты дзень па вёсцы неслі пудзіла і ўсе аднавяскоўцы прывязвалі кавалачак тканіны, або пояс, стужку і загадвалі жаданне пра тое, з чым хацелі развітацца ў наступным годзе, або прасілі прабачэнне за свае дрэнныя ўчынкі, што “сімвалізавала грахі чалавека за мінулы год” [1, с.112].

Акрамя таго, масленічнае вогнішча у большасці было складзена са старых, аджыўшых свой век рэчай, прыладаў працы селяніна, прадметаў хатняга ўжытку, – усяго, што накапілася за зіму. І вось, калі сабралася ўся вёска, запальвалі рытуальнае вогнішча, палілі пудзіла, пасля чаго пачыналіся вясёлыя карагоды, спевы ды гульні. Самыя смелыя пераскоквалі праз агонь, каб “зняць з сабе грахі”, часцей за ўсё такім чынам ачышчаліся тыя, хто хадзіў у абрадавым адзенні, так званыя “ражаныя”. Таксама, як і каля рытуальнага вогнішча, якое запальвалі на Купалле, у гэты час варажылі: “калі дым ад лучнікаў ідзе уверх – лён вырасце доўгі, калі дым сцелецца па нізе – дрэнны” ці “сыпалі на агонь кастрыца: калі іскры ляцелі густа, значыць, лён вырасце густы, калі рэдка – рэдкі” [1, с. 113, 116]. Гэтыя варожбы адлюстроўвалі і думкі, і мары селяніна-беларуса пра добры ўраджай, які прасілі ў Бога (што і зразумела, бо ад будучай вясны залежыла на колькі добрым будзе ўраджай наступнага года).

Купальскае вогнішча распальвалі ў ноч з 6 на 7 ліпеня, адзін з самых знакавых дзён беларускага народнага календара, прысвечанае галоўнаму бажаству беларусаў – Сонцу [4, с. 116]. «Класць, раскладваць Купалу», як гаворацць ў народзе, пачыналі зранку, гэтым займаліся хлопцы, яны збіралі па дварах старыя рэчы і сухія вянкі, венікі, якія засталіся пасля Зялёных святак, галлё на ўскрайку леса. Далей выбіралася месца – узвышша за вёскай, каля ракі ці возера. Такім месцам магло стаць і скрыжаванне дарог. Як заходзіла сонца, трэба было паліць вогнішча, але гэта было настолькі важным рытуалам для нашых продкаў, што рабіць гэта можна было толькі пры двух умовах. Па-першае, вогнішча павінен раскласці самы старэйшы ў вёсцы, якога і называлі Купала. Па-другое, распальваць вогнішча ён павінен ад «жывога агню», што значыць распаліць вогнішча ад агню, здабытага трэннем. Запальванне Купальскага вогнішча было сапраўднай кульмінацыяй ва ўсім свяце, пасля гэтага пачыналіся карагоды, танцы і скокі праз вогнішча, якія павінен быў зрабіць кожны, каб ачысціцца і «спаліць» ўсё дрэннае ў сабе. Нават для самых старых людзей рабілі невялічкае вогнішча, праз якое маглі прайсці-падскокнуць і яны. Акрамя сэнса ачышчэння праз скокі, купальскае вогнішча выкарыстоўвалі пад час варожбы: не разарвуцца рукі каханых, калі яны скочаць праз вогнішча – будуць разам, а калі разарвуцца – шчасця разам не бачыць. Акрамя рытуальнага вогнішча на Купалле абавязкова “сонейка” – прасмаленае кола падпальвалі і пускалі з пагорка. Сапраўды вогненнае свята адбывалася ў нашых продкаў у самую кароткую ноч года.

Такім чынам, мы бачым, што агонь быў заўсёды побач з беларусам і з’яўляўся абавязковай складовая многіх абрадаў. Найбольшае выкарыстанне рытуальных вогнішчаў бачна ў свяце Купалле і Масленіца – святах, якія прысвячаліся галоўнаму бажаству славян – Сонцу.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1.Валодзіна, Т.В., Кухаронак, Т.І. “Ядраное жыта гаспадара кліча...”: каляндарны год у абрадах і звычаях/ Т.В. Володзіна, Т.І. Кухаронак. – Мінск : Беларуская навука, 2017 – 356 с.

2.Зямля стаіць пасярод свету… / уклад., прадм., пераклад, бібл. У. Васілевіча. – Мінск : Маст. літ., 1996. – 591 с. – (Беларускія народныя прыкметы і павер’і ; кн. 1.)

3. Котович, О. В. Ритуальные костры в традиционной обрядовой практике белорусов: семантические и структурно-функциональные аспекты / О. В. Котович // Культура. Наука. Творчество : сб. науч. ст. : XI Междунар. науч.-практ. конф. (Минск, 4 мая 2017 г.) / Белорус. гос. ун-т культуры и искусств [и др.]. – Минск, 2017. – Вып. 11. – С. 277–282.

4. Ліцьвінка, В .Д. Святы і абрады беларусаў / В. Д. Ліцьвінка. – 2-е выд. – Мінск : Беларусь, 1998. – 190 с.

Малюшенко А.Д., студент 108 группы
дневной формы обучения
Научный руководитель – Гончарик Н.Г.,
старший преподаватель

## ИСКУССТВО АНАЛОГОВОЙ ФОТОГРАФИИ В ЦИФРОВОМ МИРЕ

В наше время многое, что окружает человека, связано с цифровыми технологиями. Мы живём в информационном обществе, где цифровизация коснулась всех сфер нашей жизни. В том числе и фотографии. Сейчас любой может мгновенно сделать десятки фотографий, отредактировать их и поделиться. Для того чтобы фотографировать, уже не нужно иметь